ВЕСЦІ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ АКАДЭМІІ НАВУК БЕЛАРУСІ № 3 2015
СЕРЫЯ ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

## *МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІЯ, ФАЛЬКЛОР*

*УДК [39+94+81'373'234](=16)*

*Л. Я. АГЕЕВА*

# РЭЛІКТЫ ДАХРЫСЦІЯНСКІХ КУЛЬТАЎ У НАРОДНЫМ АРНАМЕНЦЕ: ВАСІЛІСК І ГРЫФОН

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі*

*(Паступіў у рэдакцыю 07.10. 2014)*

Для даследчыкаў старажытнасцей Усходняй Еўропы ўяўляе цікавасць выява арлінагаловага грыфона, паколькі антычныя аўтары лічылі месцам іх пасялення скіфскія землі. Пра іх вядома, што яны ваявалі з племем аднавокіх арымаспаў з-за золата [25, т. 1, с. 336]. У нашым артыкуле ўжо разглядалася гэтае племя і была прапанавана гіпотэза пра іх этнічны склад [3]. Дадзеная тэма прыцягвала да сабе шматлікіх аўтараў як у антычны, так і ў сучасны час, тым не менш, грыфоны дагэтуль застаюцца загадкавымі істотамі. І калі прыняць да ўвагі, што любы міф – гэта своеасаблівы спосаб захавання гістарычнай інфармацыі, то, магчыма, даследаванне грыфонаў можа адкрыць цікавыя факты з гісторыі Усходняй Еўропы.

Экзатычных істот грыфонаў з арлінай галавой і целам ільва грэкі называлі «сабакамі Зеўса», што дало падставу даследчыкам атаясамліваць грыфона з іранскім Сэнмурвам, які меў цела льва і пысу сабакі, вядомага старажытным славянам як Семарг(л). У Нікіфараўскім летапісы маюцца звесткі пра тое, што ў пачатку кіравання князя Уладзіміра, на грудзе ў Дняпра сярод сямі галоўных славянскіх божастваў, такіх як Пярун, Хорс і Дажбог, стаяў таксама ідал «Семаргаа» [30, с. 22]. Тым не менш беларускай міфалогіі гэты персанаж невядомы. Аднак пазней, у XVII ст. грыфон трапляецца на шляхецкіх гербах, напрыклад, Браніцкіх і Сапегаў [22, с. 230], на цэхавых гербах магілёўскіх седляроў і шубнікаў [42, с.516] і на кафлях XVII ст. з Навагрудка (МСБК). Калі звярнуцца да археалогіі, то яго можна сустрэць на знаходках XIII ст. : касцяных грабянях, зробленых з самшыту (захоўваюцца ў Музеі беларускага Палесся ў Пінску) [21, малюнак 158], і з Менску [21, с. 93]. К. А. Лавыш паведамляе, што матэрыял гэтых грабянёў – самшыт – імпартны і традыцыйна прывозіўся на Русь з Прычарнамор'я і Міжземнамор'я [21, с. 94]. Яшчэ адна знаходка – бронзавая накладка на драўляны кубак таго ж перыяду з Полацку [21, малюнак 162].

Як міфічная істота Грыфон першапачаткова мог уяўляць сабой такую прыродную з'яву, як тайфун ці віхраслуп. Напрыклад, індыйская Гаруда, з якой некаторыя даследчыкі параўноўваюць Грыфона, рухам сваіх крылаў выклікае буру [25, т. 1, с. 266]. Падобнымі ўласцівасцямі валодае і Семург у «Шахнаме»: «*Его ты с крылатой горой бы сравнил. // В когтях унести в поднебесье слона // И чудище моря с глубокого дна // Поднять нипочем ему... // Довольно ему над равниною взмыть // Чтоб солнцу померкнуть, чтоб миру застыть*» [6, с. 127]. У рускіх казках Грыф-птушка згадваецца ў казцы «Норка-звер», дзе яна адпавядае іранскаму Сэнмурву: «Яна гэткая велізарная, што зацямняла сабою сонечнае святло, а ў іншай казцы ўздымаецца віхор ад узмаху крылаў птушкі-львіцы, або грыф-птушкі, якая была велічынёй з гару» [36, с. 101–102].

Аб узнікненні ў старажытнасці культу прыроднай з'явы апавядае Герадот. Паўночна-ўсходні вецер Гелеспонт у берагоў Магнэсіі выклікаў буру і выкінуў персідскія караблі на сушу. Ратаваліся толькі тыя, якіх своечасова выцягнулі на бераг. Афіняне заўважылі пачатак буры і сталі пры-

носіць ахвяры і заклікаць Барэя... каб ён дапамог знішчыць варварскія караблі. Герадот выказвае з нагоды гэтага сваё меркаванне: «Зрэшты, з-за гэтага Барэй абрынуўся на варварскія караблі, якія стаялі на якары, гэтага я не магу сказаць. Афіняне ўзвялі храм Барэю на рацэ Іліsі, аказаўшы яму гэтым найвышэйшае ўшанаванне» [18, с. 122]. Прычым такое містычнае мысленне было ўласціва не толькі грэкам. Напрыклад, цар персаў Ксеркс, калі пасля буры мора выкінула персідскія караблі на сушу, загадаў бічаваць мора і накласці на яго кайданы [18, с. 129]. Праўда, потым пераправа персаў праз Гелеспонт была абстаўлена рэлігійнымі цырымоніямі: малітвамі Сонцу, зажыганнем ахвярных пахаў, высланнем шляху міртавымі галінкамі, пасля чаго цар зрабіў ахвяrапрынашэнне – кінуў у мора залаты кубак і меч акінак [18, с. 125]. Паводле Дж. Фрэзера, у XIX ст. ва Усходняй Афрыцы ні адзін віхраслуп не прамчыцца без таго, каб за ім не пагнаўся тузін мужчын з аголенымі кінжаламі, наносячы ўдары ў цэнтр пыльнага слупа з намерам выгнаць злога духа, які, паводле павер’я бедуінаў, скача конна на ўрагане [40, с. 84].

Па сваіх міфалагічных функцыях Грыфон блізкі цмоку. Напрыклад, згадванне пра грыфонаў, якія ахоўваюць *золата*, мае свой аналаг у грэчаскай міфалогіі, дзе цмок у Калхідзе ахоўвае *залатое* руно, іншы цмок ахоўвае *залатыя* яблыкі на *залатым* дрэве ў садах Гесперыд, якія павінен быў прынесці цару Эўрысфею Геракл [19, с. 159]; у скандынаўскіх народаў існуе павер’е, што цмок ахоўвае скарбы і адкрывае іх у свята, на саракавы дзень пасля Вялікадня [26, с. 120]. Абедзве фантастычныя істоты, як грыфона, так і цмока, звязаны з ідэяй улады. Калі разглядаць грыфона з пункта гледжання этымалогіі яго зааморфных сімвалаў, ад якіх ён паходзіць, то назіраецца адзіная ідэя, якая злучае іх: як арол – *цар птушак*, так і леў – *цар звяроў*, а пры аб’яднанні іх у адну істоту атрымліваецца такое паняцце, як «цар цароў», папулярнае калісьці на Усходзе. Паводле кітайскіх павер’яў, калі чалавеку прысніцца цмок, такі чалавек можа стаць імператарам. У іранскай міфалогіі існуе такое ж паданне, напрыклад, злы цмок Ажы Дахака (*ажы* – змяя, цмок) у «Шах-Наме» Фірдаўсі выступае як іншаземны цар-тыран Мідыі [5, с. 79]. Д. С. Раеўскім таксама даюцца звесткі, што цмокі і розныя жывёлы ў старажытнасці *служылі для пазначэння рангу свайго ўладальніка* [31, с. 15], а *штандар з выявай цмока* меў распаўсюджанне ў парфян, сарматаў і дакаў. У іх ён быў сцягам атрада ў адну тысячу чалавек. Падчас кіравання Траяна цмокі з’явіліся таксама і ў рымлян [17, с. 134].

Славянскай міфалогіі вядомы Васіліск, назва якога з грэчаскай мовы азначае «*царок*». Яго выява трапілася нам на калужскім ручніку, а ў летапісу, акрамя падобнай выявы, дадзена і яго назва [11, с. 48] (малюнак, *а*, *б*, *в*). Васіліска згадвалі Арыстоцель, Геліядор, Клаўдзій Эліян і Пліній Старэйшы. Тым не менш, як адзначаў У. Задарожны, ні адзін антычны аўтар падрабязна не апісаў яго, а запазычанне міфалагічнага сюжэта іншымі этнасамі абавязкова прыводзіла да трансфармацыі яго «іканаграфічнай» выявы. Самай распаўсюджанай інфармацыяй пра Васіліска з’яўляецца тое, што яго погляд быў смяротны і выпальваў траву, камяні ператвараў у пыл, а сам ён баяўся крыку пеўня [11, с. 48]. Тут таямнічы Васіліск вельмі нагадвае Вія М. В. Гогаля, а значыць, верагодна, пеўні на беларускіх ручніках вышываліся не з декаратыўнай мэтай, а з абярэгавай. У старажытнарымскіх храмах скура «царка» (тут ён уяўляўся ў выглядзе змея) вісела для адпужвання гадаў і скарпіёнаў, і ніхто не сумняваўся, што калі працерці срэбра попелам спаленага Васіліска, то яно ператворыцца ў *золата* [11, с. 48]. Цмок у рускіх казках таксама завецца Змеем (Гарынычам) а Агністы Змей, ці «чарнаморскі змей» – устойлівы знак конных орд паўднёвых вандроўнікаў, раптоўна нападаючых на славян і патрабуючых сабе даніну ў выглядзе дзяўчын [33, с. 18]. А вось яшчэ адно імя міфічнай істоты, неабыякавай да золата, пра якую згадвае А. С. Пушкін: «Там царь *Кощей* над златом чахнет», паколькі «*кощюнной*» істотай узгадваюць Грыфона-Семарга і рускія летапісы [34, с. 631]. К. В. Трэвер паведамляе яшчэ адну з назваў гэтай міфічнай звераптушкі ў артыкуле «Сэнмурв-Паскудж, сабака-птушка» [38], у якой праглядаецца негатыўная этымалогія. У беларускім слове санскрыцкага паходжання «*пачвара*» адлюстроўваецца негатыўнае стаўленне да цмокападобнага персанажа.

Сярэдневяковыя бестыярыюмы распавядалі, што найлепшы спосаб загубіць Васіліска прыдумаў Аляксандр Македонскі. Монстар забіў нямала яго ваяроў, і тады цар паднёс да яго пысы люстэрка – і той загінуў ад уласнага погляду. У старажытнасці лічылі, что Васіліск-змей нарадзілся з кроплі крыві Мядузы-Гаргоны, якая таксама загінула, калі ўбачыла сваё адлюстраванне




Выявы васіліска і грыфона ў помніках мастацтва: *а* – калужскі ручнік з выявай Васіліска, пач. XX ст. (з прыватнага архіва З. І. Зіміной); *б* – фрагмент ручніка; *в* – Васіліск, мініяцюра з рукапісу [11, с. 49]; *г* – калоны палаца з грыфонамі, Персеполь; *д* – залаты бранзалет з Амудар'інскага скарбу з грыфонамі па канцах [4, с. 16]; *е*, *ж*, *з* – дэкарыраванне дзяржальняў скіфскіх мячоў: *е* – з скіфскага кургана «Сем Братоў», Прыкубанне, V ст. да н. э. [6, с. 29]; *ж* – махайра (крывы меч з адным лязом), зробленая з цэлага кавалка слановага біўня, Бактрыя, V ст. да н. э. [29, с.266]; *з* – дзяржальня бронзавага мяча, Алтай [4, с. 93]; *і* – скіфскія парадныя дзіды [27, с. 115 ]; *к* – беларускі ручнік са схематычным малюнкам грыфона, в. Раманава Гомельскай вобл., пач. XX ст. [15, с. 153]; *л* – фрагмент ручніка з грыфонам; *м* – фрагмент ручніка 1880 г. з выявай грыфона, Цвярская губ., Расія [14, с. 64]; *н* – фрагмент вышыўкі жаночага галаўнога ўбора са стылізаваным грыфонам, канец XIX ст. , Архангельская вобл. [24, с. 28-б, каляровы малюнак]; *о* – ручнік з грыфонамі, пачатак XX ст., Калужская губ., Думінічскі р-н, в. Маслава, Расія (з прыватнага архіва З. І. Зіміной)

на люстраной паверхні шчыта Пярсея [11, с. 49]. Калі прыняць да ўвагі, што Аляксандр Македонскі далёка не міфічны персанаж, то яго выява на дыядэме XII стагоддзя з Сахноўкі, дзе ён ляціць у калясніцы, запрэжанай двума грыфонамі [34, с. 615], і той жа сюжэт на Дзмітраўскім саборы XII ст. у горадзе Уладзіміры [34, с. 646] з'яўляюцца нейкай алегорыяй перамогі («*запрагаць*» у значэнні «*пакараць*»). Такім чынам, грыфон можа мець дачыненне да нейкага гістарычнага персанажа.

Прынцыпы з'яўлення этнонімаў у старажытных народаў Азіі разглядаліся рознымі даследчыкамі-этнографамі і ўсходазнаўцамі, якія лічылі, што татэмічны субстрат адыгрываў важную ролю і ў старажытным этназ'яўленні. Паводле меркавання П. Будберга, у большасці выпадкаў яны бяруць пачатак ад назваў птушак, жывёл, прылад вытворчасці і г. д. [12, с. 75, 76]. Дж. Фрэзерам даследаваліся назвы плямёнаў у абарыгенаў выспы Вітар, які знаходзіцца паміж Новай Гвінеяй і Цэлебесам. Насельніцтва гэтай выспы лічыць сябе нашчадкамі кабаноў, змей, кракадзілаў, гепардаў, сабак і вугроў [40, с. 443]. Прычым падобная з'ява захавалася не толькі на далёкіх выспах, адрэзаных ад цывілізацыі. І. У. Уласава паведамляе, што яшчэ ў пачатку XX стагоддзя на Сярэднім Урале нечакана сталі заяўляць пра сабе «*гамаюны*». Дагэтуль былі вядомы гамаюны Калужскай губерні (Ніжнесяргінскі р-н Свярдлоўскай вобл.), дзе ад іх засталася толькі памяць. Гэта былі прыгонныя сяляне баяр Рамаданаўскіх. Баяры мелі мянушку – гамаюны, *паколькі ў іх гербе меўся малюнак гэтай птушкі*. Цікава, што гэтая назва і розныя яго тлумачэнні шырока распаўсюджаны ў гаворках аж да Амура. А пра сваё «гамаюнскае» паходжанне памятаюць дагэтуль гамаюны Сярэдняга Урала [7, с. 123].

Некаторыя аўтары звязваюць грыфонаў са скіфскімі плямёнамі, якія пакінулі пасля сябе шматлікія надмагільныя будынкі ў выглядзе курганоў з каменнымі насыпамі, размешчанымі не толькі ва Усходняй Еўропе, але і ў горных далінах на Алтаі [10, с. 31]. Старажытнагрэчаскія крыніцы побач з грыфонамі абавязкова згадваюць аднавокіх арымаспаў. Сюжэт нападу грыфонаў на волатаў арымаспаў вельмі папулярны ў скіфскім мастацтве. Ён згадваецца таксама і ў кіргізскім эпасе «Манас» [1, с. 150–251], а таксама ў чудскіх паданнях пра чудзь, «паноў» і асляпленне ворагаў [27, с. 40]. Гэта дало падставу сцвярджаць, што арымаспы былі аднавокімі не ад нараджэння, а з-за традыцыі скіфаў пазбаўляць палонных правага вока, пра што пісаў яшчэ Герадот. Такі спосаб таўравання пазбаўляў іх магчымасці страляць з лукаў [3].

Выява грыфонаў упершыню з'явілася ў III тыс. да н. э. у эламіцкім мастацтве (паўднёва-заходняя частка Ірана, сучасны Хузістан), дзе іх вырэзвалі на пячатках [9, с. 139]. Грыфонамі ўпрыгожаны слупы персідскага палаца ў Персеполі (малюнак, *г*), даследчыкам добра вядомы залаты царскі бранзалет з Амудар'інскага скарбу з грыфонамі на канцах (малюнак, *д*) [4, с. 16]. У Казахстане ў могільніку скіфскага тыпу (з трохгранным наканечнікам стралы) выяўлена зашпілька з рога аленя ў выглядзе грыфона [4, с. 24]. Досыць часта грыфонамі ўпрыгожваецца скіфская зброя. Напрыклад, у раннескіфскім пахаванні знойдзены набор бронзавых наканечнікаў стрэл келермескага тыпу і *касцяное навершша лука* ў выглядзе грыфона (Прыкубанне) [23, с. 337]. Дзяржальні скіфскіх мячоў таксама ўпрыгожваліся выявай грыфона, напрыклад, з кургана Сем Братоў (Прыкубанне), V ст. да н. э. (малюнак, *е*) [6, с. 29], а таксама меч, знойдзены на тэрыторыі Бактрыі (сучасны Таджыкістан), выразаны са слановай косткі, V ст. да н. э. Круглая адтуліна для вока выразана ў выглядзе ўстаўкі для каштоўнага каменя (малюнак, *ж*) [29, с. 266]. На Алтаі ў кургане V ст. да н. э. выяўлены бронзавы меч, дзяржальня якога дэкарыравана двума грыфонамі (малюнак, *з*) [4, с. 93]. Прадстаўленыя дзяржальні найбольш цікавыя па сваіх мастацкіх асаблівасцях, але не адзіныя, дзе можна ўбачыць грыфонаў. На Львоўшчыне знойдзены бронзавы фрагмент скіфскага мяча I ст. н. э., які таксама ўпрыгожаны грыфонам [8, с. 299], як і залатая абкладка ножан са скіфскага кургана Прыдоння (VI ст. да н. э.) [6, с. 130]. Грыфонамі дэкарыруюцца і скіфскія цырыманіяльныя дзіды (малюнак, *і*) [27, с. 115]. Паводле паведамлення І. Кадлубай, скіфскія воіны насілі не толькі мячы, але і раменныя паясы, сагайдакі, упрыгожаныя залатымі і срэбнымі бляшкамі з постацямі грыфонаў, звяроў і птушак [16, с.119]. У скіфскіх курганах знаходзілі таксама бронзавыя бляхі і *налобнікі у выглядзе грыфонаў* (IV–III стст. да н. э.) [41, с. 275]. Пра тое, што грыфон быў вельмі папулярны ў скіфаў, сведчыць таксама і паведамленне А. М. Ляскова пра жаночае пахаванне IV ст. да н. э. На галаве памерлай была тканая накідка, канцы якой,

апускаючыся на плечы, былі абабіты 13 прастакутнымі залатымі бляшкамі з малюнкам грыфона [23, с. 337]. Верагодна, лік 13 у скіфаў лічыўся сакральным, бо ў скіфскім кургане на поўдні Беларусі (ля в. Хільчыцы Жыткавіцкага р-на Гомельскай вобл.) былі знойдзены таксама 13 наканечнікаў стрэл, якія экспануюцца ў Музеі старажытнабеларускай культуры НАН Беларусі.

У славян існаваў шэраг міфаў і эпічных паданняў, якія дажылі да пачатку XX стагоддзя, у якіх паведамляецца пра «чарнаморскага змея», які патрабаваў сабе даніны. У канчатковым выніку славяне перамагаюць таго «змея», запрагаюць яго ў плуг і абганяюць на ім гіганцкую разору – вал, які агароджвае кіеўскую зямлю (т. зв. «Змяіныя валы»). Перамогу над ім, паводле даных эпасу, дапамаглі атрымаць два чароўныя кавалі, якія выкавалі зброю [33, с. 18]. Магчыма, гэтай зброяй былі дзіды, паколькі ў словах «*копьё*» і «*копейка*» адзін і той жа корань. Пра тое, што, напрыклад, у Афрыцы, наканечнікі стрэл выконвалі ролю грошай, маюцца звесткі ў В. Н. Рабцэвіча [35, с. 22]. Як вядома, у антычныя часы грыфонаў чаканілі на манетах Баспорскага царства ў Таўрыдзе (сёння Крым) [39, с. 351], таму ў словах «*грыфы*» і «*грыўны*» таксама праглядаецца ўзаемасувязь са значэннем «грашовая адзінка».

Нарадзіўшыся калісьці на Усходзе, выява грыфона была папулярна ў антычныя часы, у сярэднявякоўе і нават у нашы дні. І калі грыфон на сучасным гербе Крыма ўспрымаецца як даніна гісторыі, то малюнак грыфона ў народных тканінах Усходняй Еўропы сведчыць пра забытыя традыцыі. Напрыклад, даследчык народных тканін Г. С. Маслава называе грыфона на архангельскім жаночым галаўным уборы XIX стагоддзя *аленем* [24, с. 28] (малюнак, *н*), хоць «рогі» «аленя» растуць не з галавы істоты, а з плеч і таму гэта – крылы. Пярэднюю нагу жывёлы, вышытую майстрыхай, таксама наўрад ці можна назваць капытом, гэта лапа жывёлы з сямейства каціных, у дадзеным выпадку – льва. Праўда, на аснове гэтай стылізаванай вышыўкі цяжка сцвярджаць, Грыфон гэта ці Семург, але яна дае падставу меркаваць, што падобны, але больш схематычны малюнак у геаметрычным арнаменце трох магілёўскіх і адным гомельскім ручніках з'яўляецца Грыфонам ці Семарглам (малюнак, *к*). Сярод апублікаваных народных тканін Беларусі гэты сюжэт знойдзены на 4 ручніках-набожніках з паўднёвага ўсходу рэспублікі [15, с. 153; 20, с. 104, 105, 140]. Яшчэ адзін варыянт схематычнай выявы грыфона ў геаметрычным арнаменце прадстаўлены на фрагменце ручніка 1880 г. з Цвярской губерні Расіі (малюнак, *м*) [14, с. 64]. Вядомы даследчык арнаментаў Сібіры і Урала С. В. Іваноў называе падобныя знакі ў фіна-ўграў «*тамгападобнымі*» [13, с. 111, мал. 62-1; с. 113]. Паводле аўтара, калісьці існаваў звычай адлюстроўваць радавы татэм нават на адзенні з мэтай паказаць сваю прыналежнасць да свайго роду [13, с. 49].

У выніку можна зрабіць выснову, што міфічная выява Грыфона, магчыма, звязана з культам магутнай прыроднай стыхіі, такой як віхраслуп, які, як і міфічная птушка Семург у персідскім фальклоры, можа і сонца зацямніць, і слана ў нябёсы панесці. Зааморфным увасабленнем гэтай стыхіі, на нашу думку, стаў Грыфон. Яго выява, злучаючы ў сабе цара жывёл ільва, а таксама цара птушак арла, у цэлым уключае ў сябе такое паняцце, як «цар цароў». У розных краінах міфічны вобраз віхраслупа мог з'явіцца як самастойна, так і быць запазычаным, і ў залежнасці ад фантазіі народа з цягам часу змяняцца, набываючы новыя асаблівасці. Напрыклад, Гаруда ў Індыі – гэта проста вялікая птушка з якасцямі Грыфона; у Арменіі гэта – двухгаловы арол, які трымае ў капцюрах быка [32, с. 39]. На нашу думку, славянам калісьці былі вядомы назвы віхравея не толькі як Семаргл ці Грыфон. Беларускія словы «*рух*», «***рух**нуць*», «*раз**рух**а*» ўключаюць у сябе назву Грыфона ў арабскіх казках «Тысяча і адна ноч» – **Рух** («Сіндбад мараход», 544-я ноч). Яна была памерам з востраў і магла цягаць па небе слана [16, с. 260 ]. Магчыма, калісьці продкі славян шанавалі і **Бар**эя, паколькі ў словах «***бур**а*» і «*раз**бур**аць*» таксама маецца адзіны корань і этымалогія з грэчаскім бажаством, якому грэкі будавалі храмы.

Паколькі Грыфон быў вельмі папулярны ў скіфаў, у якіх коні, мячы, лукі, налобнікі і зашпількі дэкарыраваліся грыфонавай эмблематыкай, а ў антычнай Таўрыдзе чаканіліся манеты з яго сімволікай, таму іранамоўных скіфскіх воінаў маглі празваць грыфонамі. Гэтыя воіны маглі быць зборшчыкамі даніны калі не золатам, то дзяўчынамі. Улічваючы даныя фальклору, у сферу скіфскага ўплыву ўваходзіла і фінамоўнае насельніцтва. Пры дынастыі Севефідаў Грыфон-Семаргл стаў сімвалам Ірана нараўне з дзяржаўным гербам. Раней намі разглядалася сімволіка дахрысціянскага бажаства Вялеса на беларускіх ручніках [2]. Беручы пад увагу, што на ручніках Усходняй

Еўропы, акрамя гэтага, можна сустрэць такіх міфічных істот, як Васіліск і нават грыфонаў з радзімы «гамаюнаў» (малюнак, *о*), ёсць падстава сцвярджаць, што жывёла на архангельскім жаночым галаўным уборы XIX ст., а таксама яго схематычныя выявы на ручніках з Цвярской губерні Расіі, з Магілёўскай і Гомельскай абласцей Беларусі ўяўляюць сабой вельмі стылізаваную выяву «кощюнного Семаргаа», які шанаваўся ў якасці аднаго з сямі галоўных багоў у пантэоне князя Уладзіміра.

Аўтар выказвае вялікую падзяку доктару мастацтвазнаўства Т. В. Габрусь за абмеркаванне артыкула і каштоўныя заўвагі, а таксама беларускаму этнографу З. І. Зіміной за прадстаўленую магчымасць працаваць з яе прыватным архівам.

## Літаратура

1. *Абрамзон, С. М.* Этнографические сюжеты в киргизском эпосе «Манас» / С. М. Абрамзон // СЭ. – 1947. – № 2. – С. 134–154.

2. *Агеева, Л. Я.* Генезіс знака «ромб з кручкамі» ў народнай арнаментыцы / Л. Я. Агеева. – Вес. Нац. акад. навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2008. – № 4. – С. 60–67.

3. *Агеева, Л. Е., Демидова, Н. Н.* Феномен «одноглазых» в истории и фольклоре /Л. Е. Агеева, Н. Н. Демидова // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў: матэрыялы Міжнар. канф. – Минск: Права и экономика, 2011. – С. 212–214.

4. *Артамонов, М. И.* Сокровища саков / М. И. Артамонов. – М.: Искусство, 1973.

5. *Арутюнян, С.* Мифы и легенды Древней Армении / С. Арутюнян. – Ереван: Аревик, 2007.

6. *Бонгард-Левин, Г. М., Грантовский, Э. А.* От Скифии до Индии / Г. М. Бонгард-Левин [и др.]. – М.: Мысль, 1983.

7. *Власова, И. В.* О терминах для обозначения этнических категорий / И. В. Власова // Этнографическое обозрение. – 2009. – №4. – С. 118–129.

8. *Войтович, В.* Українська міфологія / В. Войтович. – Київ: Либідь, 2005.

9. Древние цивилизации / под ред. Г. М. Бонгард-Левина. – М.: Мысль, 1989.

10. *Завитухина, М. П.* Пазырык. Древняя самобытная культура алтайских кочевников/ М. П. Завитухина // Курьер ЮНЕСКО.– 1977.– Январь. – С. 31–37.

11. *Задорожный, В.* Василиск – царёк в изгнании / В. Задорожный // Наука и религия. – 1990. – № 4. – С. 48–49.

12. *Зуев, Ю. А.* Киргизы-буруты (К вопросу о тотемизме и принципах этнонимообразования) / Ю. А. Зуев // СЭ. – 1970. – № 4.– С. 74–86.

13. *Иванов, С. В.* Орнамент народов Сибири как исторический источник / С. В. Иванов. – М.; Л.: АН СССР, 1963.

14. *Калмыкова Л. Э.* Народная вышивка Тверской земли. Вторая половина XVIII – начало XX в. / Л. Э. Калмыкова. – Л.: Художник РСФСР, 1981.

*15. Кацар, М. С.* Беларускі арнамент. Ткацтва, вышыўка / М. С. Кацар. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 1996.

16. *Кодлубай, І.* Відображення скіфського світогляду у мистецтві VII–VIII стст. до н. е. на території України / І. Кодлубай // Народознавчі зошити. – 2006. –№ 1–2. – С. 112–125.

17. Книга тысячи и одной ночи: в 8 т. – Т. 5. – Душанбе: Ирфон, 1983.

18. *Козленко, А. В.* Военная история античности. Словарь-справочник / А. В. Козленко. – Минск: Беларусь, 2001.

19. *Корзун, М. С.* Концепция «зависть богов» (Fthonos Theon) и религиозно-идеологическая борьба во время греко-персидских войн (по данным Геродота) / М. С. Корзун // Выбраныя навуковыя працы Беларус. дзярж. ун-та: у 7 т. Т. 2: Гісторыя. Філалогія. Журналістыка ; адк. рэд. А. А. Яноўскі. – Мінск: БДУ. – 2001. – Январь. – С. 119–133.

20. *Кун, Н. А.* Легенды и мифы Древней Греции / Н. А. Кун. – Минск: Народная асвета, 1985.

21. *Лабачэўская, В. А.* Повязь часоў / В. А. Лабачэўская. – Мінск: Беларусь, 2009.

22. *Лавыш, К. А.* Художественные традиции восточной и византийской культуры в искусстве средневековых городов Беларуси (X – XIV вв.) / К. А. Лавыш. – Минск: Белорус. наука, 2008.

23. *Лазука, Б. А.* Гісторыя беларускага мастацтва / Б. А. Лазука. – Мінск: Беларусь, 2007. – С. 230.

24. *Лесков, А. М. Кубышев, А. И., Румянцев, А. Н.* Исследования Каховской экспедиции / А. М. Лесков [и др.] // Археологические открытия 1971 года. – М.: Наука. – 1972. – С. 336–338.

25. *Маслова, Г. С.* Орнамент русской народной вышивки / Г. С. Маслова. – М.: Наука, 1978.

26. Мифы народов мира. Энцикл.: в 2 т. – М.: Сов. Энцикл., 1991.

27. *Морозова, М. Н.* Скандинавские народы / М. Н. Морозова // Календарные обычаи и обряды в странах зарубежной Европы. Весенние праздники. – М.: Наука, 1977. – С. 110–121.

28. Музей исторических драгоценностей УССР. – Киев: Мистецтво, 1984.

29. *Пименов, В. В.* Чудские предания как источник по этнокультурной истории Европейского севера СССР / В. В. Пименов // Сов. этнография.– 1968. – № 4. – С. 30–42.

30. *Пичикян, И. Р.* Парадные ножны греко-бактрийских мечей / И. Р. Пичикян // Проблемы античной культуры. – М.: Наука, 1986.– С. 264–272.

31. Полное собрание русских летописей.– Т. 35. – М.: Наука, 1980.

32. *Раевский, Д. С.* Искусство и мифы скифов. Заговорят ли изображения? / Д. С. Раевский // Курьер ЮНЕСКО.– 1977. – Январь.– С. 14–16, 41.

33. *Рассадин, С. Е.* Гнездо двуглавого орла / С. Е. Рассадин. – Минск: Беларусь, 2008.
34. *Рыбаков, Б. А.* Киевская Русь и русские княжества XII-XIII вв. / Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1982.
35. *Рыбаков, Б. А.* Язычество Древней Руси / Б. А. Рыбаков. – М.: Наука, 1988.
36. *Рябцевич, В. Н.* О чем рассказывают монеты / В. Н. Рябцевич. – Минск: Народная асвета, 1977.
37. Славянская мифология. Словарь-справочник. – М.: Линор и Совершенство, 1998.
38. *Тревер, К. В.* Сэнмурв-Паскудж, собака-птица / К. В. Тревер. – Л.: Гос. Эрмитаж, 1937.– 74 с.
39. *Туровский, Е. Я.* Грифон на античных монетах / Е. Я. Туровский //Сугдейский сборник. – Киев-Судак: Академпериодика, 2004. – С. 348–351.
40. *Фрэзер, Дж.* Золотая ветвь / Дж. Фрэзер. – М.: Политлитература, 1983.
41. *Черненко, Е. В.* Скифские курганы под Скадовском / Е. В. Черненко // Археологические открытия 1970 года. – М.: Наука, 1971.
42. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: у 6 т. – Т. 2. – Мінск: Беларус. Энцыкл., 1994.

*L. E. AHEYEVA*

**RELICTS OF PRE-CHRISTIAN CULTS IN THE NATIONAL ORNAMENT: BASILISK AND GRIFFIN**

## Summary

Ancient Greek historian Herodot informed that in the 4 century BC in the territory of the Eastern Europe there were not only Scythians, but also a tribe one-eyed arimaspians which was at war with mysterious Griffins because of gold.

Earlier we considered a tribe arimaspians and the hypothesis about the reason of their unusual appearance has been offered.

This article is a continuation of this theme where the tribe of Griffins has been investigated. Hypothesis about an origin of a mythological image of griffin has been offered. Also its cult at Iranian Scythians has been considered.

Stylized images of griffin among geometrical patterns of Belarus ritual towels in the East of Belarus (in the Mogilyov and Gomel regions) has been found out.